**Заняткі па развіцці беларускага маўлення дзяцей ад 5 да 6-гадоў**

Н.С. Старжинская, Д.Н. Дубинина

## Занятак 1. Нашы імёны

**Праграмны змест**. Замацоўваць ужыванне традыцыйных беларускіх формаў імёнаў. Практыкаваць у выкарыстанні інтанацыйных сродкаў у дыялозе. Вучыць карыстацца тыповымі канструкцыямі: “Мяне зваць …”, “Яе (яго) зваць ...”, “Мне (яму, ёй) ... гадоў”, “Як цябе зваць?”. Звярнуць увагу на спосабы ўтварэння некаторых слоў. Развіваць актыўнае маўленне дзяцей, садзейнічаць наладжванню іх маўленчых зносін.

**Матэрыял**: лялькі Янка і Алеся, сцяжок, вучэбны наглядны дапаможнік (Дзіцячая пляцоўка).

**Ход.**

В. Янка хоча загадаць вам загадку: “У цябе яно ёсць, у мяне яно ёсць, у яго таксама ёсць”. Што гэта? (*Дзеці выказваюць свае меркаванні*). У кожнага з нас ёсць імя. І ў мяне яно ёсць, у цябе таксама ёсць, і ў цябе ёсць (выхавальнік звяртаецца да некалькіх дзяцей), і ў нашых ляляк ёсць – ва ўсіх нас ёсць сваё імя. Давайце назавем свае імёны.

*Выхавальнік бярэ сцяжок і называе сябе*: “Я - Іна Андрэеўна, а цябе як зваць?”. *Перадае сцяжок лялькі:* “Я – Янка, а цябе як зваць?” – “Я - Алеся, а як цябе зваць?” – “Я ...” і г.д.

Паслухайце верш пра дзетак.

**Мала еў кашы**

У перагонкі мы гулялі:
Хто ўсіх абгоніць – чэмпіён.
Прыбег на фініш першым Валік,
Другім – Антон. Адстаў Сымон.
Антон штурхнуў яго і кажа:
Ты раніцай еў мала кашы…

Сымон падумаў: “Сапраўды –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У мяне з кашай нелады.
Падвою я ў абед меню
І вас усіх пераганю!”

На жаль, не перагнаў нікога.
“Ідаць, я з’еў занадта многа
І цяжка беглі мае ногі”.

І вырашыў Сымонка так:
Не есці кашы больш ніяк.

І. Муравейка

В. Назаві імёны дзетак, што ты пачуў у вершы.

*Выхавацель прапаноўвае дзецям адкрыць вучэбны наглядны дапаможнік і арганізуе дзейнасць на старонцы “Дзіцячая пляцоўка”.*

В. Давайце пагуляем. Гульня называецца “Назаві сваё прозвішча”.

*Дзеці ідуць па кругу. У сярэдзіне стаіць вядучы (спачатку гэта выхавальнік), які прыгаворвае:*

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Бавім час мы не дарма –
Просім хуценька назваць
Свае прозвішча, імя!

Т. Шылько

*Вядучы паказвае на якое-небудзь дзіця, а тое хуценька называе свае імя і прозвішча.*

### Занятак 2. Розныя імёны

**Праграмны змест**. Увесці ў слоўнік новыя словы, замацоўваць вядомыя: *імя, прозвішча, гаспадыня, сябар, дачка, унук, унучка, бабуля, дзядуля* і інш. Практыкаваць у выкарыстанні інтанацыйных сродкаў у дыялозе. Звярнуць увагу на спосабы ўтварэння некаторых слоў. Развіваць камунікатыўныя ўменні дзяцей на беларускай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Матэрыял**: лялькі Янка і Алеся. Малюнкі. Сцяжок. Малюнкі або вобразныя цацкі  казачных персанажаў: ваўка, Чабурашкі, вавёркі, зайца, Дзюймовачкі і інш.

**Ход.**

*Лялька Алеся гаворыць*: "У кожнага з нас ёсць імя. Давайце назавём свае імёны.

Акрамя тых імёнаў, што вы назвалі, у вас ёсць яшчэ шмат іншых назваў. Паслухайце! Алёша, як  цябе называюць мама і тата? (Алёша, Лёша.) А яшчэ як? (Сынок.) А цябе, Віта, як называюць мама і тата? (Дачка, дачушка.) А як вас называюць дзядуля і бабуля? (Унук, унучка.) Як вас называюць вашы родныя ласкава?(сонейка, зайчык, коцік, радасць мая... ) Вось бачыце, колькі ў нас назваў акрамя імёнаў.

*Выхавацель прапаноўвае дзецям адкрыць вучэбны наглядны дапаможнік і арганізуе дзейнасць на старонцы "Розныя назвы".*

Выхавацель звяртаецца да дзяцей.

Давайце пагуляем. Кожны з вас пераўтварыцца ў які-небудзь  казачны персанаж. А хто ў які – вам падкажа малюнак. Я вам дам малюнкі. У каго хто намаляваны, той у таго і пераўтварыцца.  Толькі нікому не паказвайце свае малюнкі і спачатку не гаварыце, кім вы будзеце. Скажаце толькі, калі будзеце знаёміцца адно з адным.

*Выхавальнік раздае малюнкі з выявамі казачных персанажаў.*

Па парах або па тройках персанажы вядуць дыялогі: "Добры дзень! Я мядзведзь. Мяне зваць Міхайла Таптыгін. Гэта мая сяброўка Ліса Патрыкееўна. А цябе як зваць? Колькі табе гадоў? Куды ты ідзеш? Прыходзь да мяне ў госці. Я цябе мёдам пачастую" і да т.п.

## Занятак 3. Як нас завуць

**Праграмны змест**. Практыкаваць дзяцей ва ўжыванні слоў, што абазначаюць людзей у розных сітуацыях (пакупнік, заўзятар, пацыент, госць, пешаход, пасажыр і інш.). Звярнуць увагу на спосабы ўтварэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

некаторых слоў. Вучыць адказваць на пытанні, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей.

**Матэрыял**: вучэбны наглядны дапаможнік (“Як нас завуць”).

**Ход.**

*Педагог нагадвае дзецям аб іх розных імёнах-назвах, пра якія ішла гаворка мінулым разам. Прапануе паслухаць верш:*

Падышла да ложка мама,
Калі я прачнулася.
Пра мяне яна сказала:
Сонейка прачнулася.

П.Прануза

В.Чаму мама сказала пра дачушку “сонейка прачнулася”? Як вас называюць вашы родныя ласкава? Вось колькі ў вас ласкавых назваў.

Але, ёсць ў нас з вамі і іншыя назвы. Адзін і той жа чалавек у розных месцах называецца па-рознаму.

*Выхавацель прапаноўвае дзецям адкрыць вучэбны наглядны дапаможнік і арганізуе дзейнасць на старонцы “Як нас завуць”.*

В. Вы хварэеце за любімую каманду? Значыць, вы – … заўзятары.

Паслухайце верш пра заўзятараў.

**Заўзятары**

За БАТЭ хварэю я,
Брат мой – за Дынама.
– Што ж вы, хлопцы, за сям’я? –
Дакарае мама.
А ў адказ кажу ёй я:
– Мы спартыўная сям’я.
Проста любім мы футбол,
Словы “матч”, “вароты”, “гол”.

Н. Гальпяровіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В. Цікава, а што азначаюць словы “шыварат навыварат”?Аднаго хлопчыка чамусьці празвалі “шыварат навыварат”. А чаму, расказвае ў сваім вершы Ніна Галіноўская:

Шыварат-навыварат!
Клічуць хлапчукі.
Шыварат-навыварат!
Хто ж гэта такі?
Мы зусім не ведаем
Гэткага імя.
Пачакайце крышачку,
Падкажу вам я.
Гэта хлопчык ветлівы,
Рослы, гаваркі.
Як і вы, рухавенькі,
Мае две рукі.
Вось яны хлапчыне
І даліся ў знак:
За што ні бяруцца –
Робяць абы-як –
Шыварат-навыварат.
Адгэтуль і пайшло –
Шыварат-навыварат
Да Сашы прырасло.

Н.Галіноўская

В. Чаму ж так назвалі хлопчыка, вы зразумелі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ